# <u>*ЛІТАРАТУРНАЯ ВІКТАРЫНА ПА ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ І ЯКУБА КОЛАСА*</u>

**<u>Мэты:</u>** абагульніць і пашырыць веды вучняў, набытыя на ўроках беларускай мовы і літаратуры, а таксама шляхам самаадукацыі; развіваць навыкі групавой дзейнасці, публічнага выступлення; абуджаць патрыятычныя пачуцці, павагу да класікаў беларускай літаратуры, любоў да роднага слова.
**<u>Афармленне класа або залы:</u>** насценгазеты, кветкі, фотаздымкі народных песняроў, столікі для камандаў і журы, засланыя нацыянальнымі абрусамі, выстава літаратуры; адведзена месца для груп падтрымкі, на дошцы запісаны ход літаратурнага турніру і табліца афармлення вынікаў.

## <u>Ход віктарыны</u>

**<u>Уступнае слова бібліятэкара</u>**

Дзве яркія і нязгасныя зоркі беларускага нацыянальнага космасу — Янка Купала і Якуб Колас. Класікі беларускай літаратуры, людзі, якія былі адданымі і шчырымі патрыётамі. З замілаваннем гучаць радкі Я.Коласа пра родны край:

*Мой родны кут, як ты мне мілы!.*
*Забыць цябе не маю сілы!*
*Не раз, утомлены дарогай,*
*Жыццём вясны мае убогай,*
*К табе я ў думках залятаю*
*І там душою спачываю.*

Спраўдзіліся тыя надзеі, якія імкнуўся ўвасобіць у жыццё Янка Купала:

*Паплыло паводкаю, загуло, як вецер,*
*Слова беларускае па вялікім свеце...*
*Падымайся з нізін, сакаліна сям'я,*
*Над крыжамі бацькоў, над нягодамі,*
*Занімай, Беларусь маладая мая,*
*Свон пачэсны пасад між народамі!..*

Аддаючы даніну павагі гэтым людзям, мы праводзім літаратурны турнір, у якім вы паспрабуеце праявіць свае веды, што набылі на працягу школьных урокаў, а таксама шляхам самаадукацыі.

<u>Знаёмства з ходам літаратурнага турніру.</u>

I. Візітка каманды
II. Размінка.
III. Пазнай героя або твор.
IV. Тэарэтычны турнір.
V. Творчы турнір:

а) працягні верш; б) выразнае чытанне верша на памяць;
в) інсцэніроўка твора; г) красворды, якія склалі каманды (дамашняе заданне).
д ) музычны конкурс е) прэзентацыя стравы нацыянальнай кухні;

VI. Падвядзенне вынікаў.
VII. Рэфлексі

Прадстаўнікам камандаў прапануецца выцягнуць парадкавы нумар, пад якім будуць прапанаваны заданні і парадак выступлення.

**I. Візітка каманды.** Назва, дэвіз, эмблема, касцюм і абгрунтаваць свой выбар папярэдняга.

**II. Размінка (пытанні ў канвертах)**

1. Назавіце сапраўдныя імёны Купалы і Коласа (запішыце поўнасцю прозвішча, імя і імя па бацьку).
2. Чаму Купала і Колас выбралі такія псеўданімы?
3. Назавіце дату і месца іх нараджэння.
4. Параўнайце гэтых людзей: чым яны падобныя і чым адрозніваюцца?
5. Успомніце і назавіце найбольш вядомыя паэмы Янкі Купалы.
6. Назавіце паэмы Якуба Коласа.
7. Згадайце назвы апавяданняў Якуба Коласа.

8. Назавіце камедыі Янкі Купалы.
9. Назавіце вершы Янкі Купалы, пакладзеныя на музыку.
10. Назавіце пасаду, якую займаў Я.Колас напрыканцы жыцця.
11. Што вы ведаеце пра сем'і Я.Коласа і Я.Купалы?
12. Як увекавечана памяць аб гэтых людзях?

Вядучы. Мы крыху ўзнавілі ў памяці звесткі біяграфічнага характару, пашырылі ўяўленне пра творчую спадчыну песняроў, а цяпер паглядзім, наколькі ўважліва вы чыталі творы пісьменнікаў, ці зможаце пазнаць героя таго ці іншага твора.

III.**Пазнай героя (конкурс капітанаў)**

**Заданні для каманды № 1**

**1)** Пазнайце героя, аўтара, назву твора.

*Ніхто з дамашніх не згадае,*
*Чым рэчка ... займае,*
*Якая іх звязала сіла,*
*І чым яна так хлопцу міла.*

*(Костусь; паэма Я.Коласа «Новая зямля», урывак «На рэчцы».)*

**2)** Пазнайце героя, аўтара, назву твора.

*Вецер абнімае стан яе дзявочы,*
*Сонца ёй цалуе шыю, твар і вочы.*
*Каласкі хінуцца перад ёй паклонна,*
*Дзівіцца ігруша на мяжы зялёнай....*
*А яна, царыца, весела, шчаслiва*
*Карануе песняй залатое жніва.*

*(Дзяўчына-жняя; верш Я.Купалы "Жняя")*

**3)** Нагадайце назву рэчкі, якую так маляўніча апісвае Я.Колас у трылогіі «На ростанях».

*«Срэбнай стужкай вывіваўся ................, то падыходзячы пад самы лес, падразаючы карэнне дрэвам, то бегучы сярэдзінаю лугу, то падступаючы да поля, апяразваючы бліскучым жывым паскам яго пясчаныя схілы. Сям-там па лугавых грудах раскідаліся барoдкі-кудзеркі астраўкоў, дзе* ***буяў*** *маладыя, сакавіты дубняк, кусты арэшніку, чаромхі і крушыны, а самая понізь засцілалася мяккаю лугавою канапелькаю, што зацвітае* ***летам*** *такімі прыгожымі сіненькімі кветачкамі...*

***Эх,*** *як прывольны прасторы ...................лугоў!*

*...»* (падручнік для V кл., с. 141).

Калі гэта заданне выклікае цяжкасці, можна прапанаваць наступныя радкі:

«...Эх, як прывольны прасторы наднёманскіх лугоў!»

*(Нёман; урывак з трылогіі «На ростанях».)*

**Заданні для каманды № 2**

1)Пазнайце героя, аўтара, назву твора.

*Але хоць колькі жыць тут буду,*
*Як будзе век тут мой вялік,*
*Ніколі, браткі, не забуду,*
*Што чалавек я, хоць .......*
*І кожны,хто мяне спытае,*
*Пачуе толькі адзін крык:*
*Што хоць мной кожны пагарджае,*
*Я буду жыць! – бо я ........*

*(Мужык; верш Я.Купалы "Мужык")*

2)Пазнайце героя, аўтара, назву твора.

*.......як толькі ажаніўся,*
*Тады ж ад бацькі аддзяліўся.,*
*Бо стала цесна.З той прычыны*
*Пайшоў на сплаў ён, на віціны...*
*..................................................*
*Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,*
*Каб з панскіх выпутацца пут,*
*І там зажыць сабе нанова:*
*Свая зямля – вось што аснова!*

*(Міхал; паэма Я.Косаса “Новая зямля”)*

3)Пазнайце героя, аўтара, назву твора.

*У яго быў свет цікавы,*
*Сбае вобразы, жыццё,*
*І ў душы яго ўсе з 'явы*
*Сваё мелі адбіццё.*
*........................................*
*Ён зайграў, і струны горка*
*Адклікаліся-гулі,*
*Аддавала іх гаворка*
*Гневам, крыўдаю зямлі.*

(Сымон*; паэма Я.Косаса “Сымон-музыка”)*

**Заданні для каманды № 3**

1) Пазнайце горад, аўтара і назву твора.

*Яго высокую магілу —*
*Дзе лес ды вецер панаваў —*
*Знаць, што вялікую меў сілу,*
*«Магілай льва» народ назваў.*
*Над ёю з часам дрэвы палі,*
*І горад вырас, як з зямлі, Яго ... назвалі,*
*Бо йнакш прыдумаць не маглі.*

*(Магілевам; паэма Я.Купалы «Магіла льва».)*

2) Пазнайце героя, аўтара, назву твора.

*... у вёсцы між сваімі*
*Найпрыгажэйшая была,*
*Грудзямі, шчочкамі, вачыма,*
*Як мак, між макамі цвіла.*
*Павеўна, як даспелы колас,*
*Ішла наперад у танок,*
*З грудзей гарачых звонкі голас,*
*Змяняла песню — як званок.*

*(Наталька; паэма Я.Купалы «Магіла льва».)*

3) Пазнайце героя, аўтара, назву твора

*Наш мілы............, наш ..............,*
*Ў дзіцячым часта быў палоне;*
*Вось так гуртом яго абсядуць*
*І час работы яго крадуць;*
*Насі «катла», кажы ім казкі,*
*Ідзі на поплаў з імі ў краскі,*
*Давай адказы на пытанні,*
*Тлумач ты ім усё дазвання:*
*"Адкуль, з чаго дзе што бярэцца,*
*Вось гэта, тое як завецца*
*І чаму так, чаму не гэтак?*
*Прыхілен ................быў да дзетак.*
*ЕН быў настаўнікам, суддзёю,*
*Калі, бывала, між сабою*
*Паспораць дзеткі ці паб'юцца,*
*Дык да каго тады звярнуцца,*
*-Як не да ................, да ..................?*
*Ох, слаўна з .............. ім жылося!*
*Яшчэ замецце, што з малымі*
*Ён размаўляў як са старымі,*
*1 з імі радзіўся, спрачаўся —*
*Як роўны з роўнымі трымаўся!*

*(дзядзька Антось; паэма Я.Косаса “Новая зямля”, урывак “ Дзядзька-кухар”)*

4) Назавіце імёны герояў, якія сустракаюцца ў паэме «Новая зямля».
*(Костусь, Алесь, Яська Базылёў, Міхал, Антось, Уладзік.)*

**Заданні для каманды № 4**

1) Пазнайце героя, аўтара, назву твора.

*Так страшна той разбойнік згінуў,*
*Што ўмеў любіць і забіваць;*
*На грэх пусціўся праз дзяўчыну*
*І мусіў праз яе сканаць...*

*(Машэка; паэма Я.Купалы «Магіла льва».)*

2) Пазнайце героя, аўтара, назву твора.

*Насілася яна над пустэлямі, перад ёю рассцілаліся моры, якія не мелі берагоў. Ганялі вятры, ірвалі на кусочкі яе тонкія валаконцы. І нідзе на свеце не было супакою. І вярнулася яна зноў у той край, адкуль і выйшла... Стары дуб, абмыўшы дажджом... сказаў:*
*- От навука для тваіх дзяцей. Моцна ж накажы ты ім, дружа, каб не лёталі дарэмна па свеце, не бадзяліся: у сваім родным кутку работы досыць для кожнага.*
*(Хмарка; алегарычнае апавяданне Я.Коласа «Хмарка».)*

3) Пазнайце героя, аўтара, назву твора.

*Стаялі хлопцы і маўчалі,*
*На ... зрэдку паглядалі,*
*А сам ... з вузел ростам,*
*Ў сваім уборы бедным, простым,*
*У зграбных портках і кашулі,*
*Стаяў, як бы яго прыгнулі,*
*Такім мізэрным і маўклівым,*
*У халаце суконным, сівым.*

*(Яська, дарэктар; урывак «Дарэктар» з паэмы Я.Коласа «Новая зямля».)*

4) Да каго звяртаецца аўтар? Чый гэта верш? Дадатковыя заданні: вызначыць від лірыкі, знайдзіце вобраз-сімвал.

*Устаньце, хлопцы, устаньце, браткі!*
*Устань ты, наша старана!*
*Ўжо глядзіць к нам на палаткі*
*Жыцця новага вясна.*
*Ці ж мы, хлопцы, рук не маем?*
*Ці ж нам сілы Бог на даў?*

*(Да беларусаў; Я.Колас, верш «Беларусам»; грамадзянская лірыка, вобраз вясны.)*

Да кожнага задання можна падабраць дадатковыя пытанні і даць магчымасць камандам зарабіць дадатковыя балы.

**III. Тэарэтычны турнір**

Каманды атрымліваюць канверты з заданнямі.

**Заданні для каманды № 1**

1) Вызначце від апісання ў літаратурным творы. Абгрунтуйце свой адказ. Праз якія сродкі мастацкай выразнасці перадаецца адухоўленасць прыроды? (Паэма Я.Коласа «Сымон-музыка», урывак з трэцяй часткі «0, край родны, край прыгожы!».)

*О, край родны, край прыгожы!*
*Мілы кут маіх дзядоў!*
*Што мілей у свеце божым*
*Гэтых светлых берагоў,*
*Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,*
*Дзе бары-лясы гудуць,*
*Дзе мядамі пахнуць грэчкі,*
*Нівы гутаркі вядуць;*
*Гэтых гмахаў безгранічных*
*Балатоў тваіх, азёр,*
*Дзе пад гоман хваль крынічных*
*Думкі думае прастор;*
*Дзе ўвосень плачуць лозы,*

*Дзе вясной лугі цвітуць,*
*Дзе шляхом старым бярозы*
*Адзначаюць гожа пуць?*

*(Пейзаж. Паэт перадае пачуцці і ўражанні, выкліканыя з'явамі, малюнкамі прыроды. Маляўнічасць. Адзінства прыроды і чалавека. Адухоўленасць перадаецца праз метафары.)*

2) Узгадайце слова-эпітэт, якое выкарыстоўвае Я.Колас у паэме «Новая зямля» да слова «кут» і да дзядзькі Антося.

*(Мой родны кут, як ты мне мілы!.. ; Наш дзядзька, мілы наш Антоні...)*

**Заданні для каманды № 2**

1) Прачытайце вершаваны ўступ Я.Коласа да ўсяго цыкла казак жыцця. Здагадайцеся, хто з'яўляецца героямі коласаўскіх казак жыцця. Дзеля чаго складаў Якуб Колас «Казкі жыцця»? Якія галоўныя каштоўнасці ён імкнуўся сцвердзіць?

*Не ў адной толькі нашай душы*
*Зерне ёсць хараства —*
*Аб ім казку складае ў цішы*
*Колас нівы, трава.*
*Не ў адным толькі сэрцы людзей*
*Іскра праўды гарыць -*
*Аб ёй песню пяе салавей,*
*Аб ёй рэчка журчыць...*

*(Героі: колас, трава, салавей, рэчка, гара, хмарка, адзін-кае дрэва, камень, балота... Каштоўнасці: хараство, праўда.)*

2) Вызначце від рыфмы па спосабе спалучэння вершаваных радкоў (парная, перакрыжаваная, кальцавая). (Урывак з паэмы Я.Коласа «Новая зямля».)

*Ідуць касцы, звіняць іх косы,*
*Вітаюць іх буйныя росы,*
*А краскі ніжай гнуць галовы,*
*Пачуўшы косак звон сталёвы. (Парная.)*

**Заданні для каманды № 3**

1) Што такое эпітэт? Знайдзіце эпітэты ў вершы Я.Купалы. Растлумачце значэнне слова «вабная».

*...Згінулі сцюжы, марозы, мяцелі.*
*Болей не мерзне душа ні адна.*
*Сонейкам цёпленькім, зеленню вабнаю*
*Адаравала зямельку вясна...*

2) Вызначце від лірыкі паводле тэмы. Абгрунтуйце свой адказ.

*Я ад вас далёка, бацькоўскія гоні, —*
*На чужое неба ўжо гляджу сягоння.*
*Але думкай, сэрцам толькі вас я знаю,*
*Як і жыў, жыву я ў сваім родным краю.*
*І няма на свеце той вялікай меры,*
*І няма на свеце так каваных дзвераў,*
*Каб хоць на часіну — ў будні ці ў нядзелі —*
*Беларусь са мною разлучыць пасмелі!*

*(Я.Купала) (Грамадзянская лірыка.)*

**IV. Творчы турнір**

1) Узнавіце верш да канца (на выбар настаўніка).
2) Выразна прачытайце верш на памяць (на выбар вучняў каманды).
3) Дамашняе заданне: музычны конкурс , прэзентацыя стравы нацыянальнай кухні; інсцэніроўка твора Я.Коласа або Я.Купалы.
4) Дамашняе заданне: падрыхтаваць красворд па біяграфіі і творчасці пісьменнікаў для камандаў сапернікаў.

**V. Падвядзенне вынікаў**

**VI. Рэфлексія**

Што спадабалася? Якія моманты найболын запомніліся? Што не атрымалася?

**II. Размінка (пытанні ў канвертах)**

1. Назавіце сапраўдныя імёны Купалы і Коласа (запішыце поўнасцю прозвішча, імя і імя па бацьку).
2. Чаму Купала і Колас выбралі такія псеўданімы?
3. Назавіце дату і месца іх нараджэння.
4. Параўнайце гэтых людзей: чым яны падобныя і чым адрозніваюцца?
5. Успомніце і назавіце найбольш вядомыя паэмы Янкі Купалы.
6. Назавіце паэмы Якуба Коласа.
7. Згадайце назвы апавяданняў Якуба Коласа.
8. Назавіце камедыі Янкі Купалы.
9. Назавіце вершы Янкі Купалы, пакладзеныя на музыку.
10. Назавіце пасаду, якую займаў Я.Колас напрыканцы жыцця.
11. Што вы ведаеце пра сем'і Я.Коласа і Я.Купалы?
12. Як увекавечана памяць аб гэтых людзях?

**II. Размінка (пытанні ў канвертах)**

1. Назавіце сапраўдныя імёны Купалы і Коласа (запішыце поўнасцю прозвішча, імя і імя па бацьку).
2. Чаму Купала і Колас выбралі такія псеўданімы?
3. Назавіце дату і месца іх нараджэння.
4. Параўнайце гэтых людзей: чым яны падобныя і чым адрозніваюцца?
5. Успомніце і назавіце найбольш вядомыя паэмы Янкі Купалы.
6. Назавіце паэмы Якуба Коласа.
7. Згадайце назвы апавяданняў Якуба Коласа.
8. Назавіце камедыі Янкі Купалы.
9. Назавіце вершы Янкі Купалы, пакладзеныя на музыку.
10. Назавіце пасаду, якую займаў Я.Колас напрыканцы жыцця.
11. Што вы ведаеце пра сем'і Я.Коласа і Я.Купалы?
12. Як увекавечана памяць аб гэтых людзях?

**II. Размінка (пытанні ў канвертах)**

1. Назавіце сапраўдныя імёны Купалы і Коласа (запішыце поўнасцю прозвішча, імя і імя па бацьку).
2. Чаму Купала і Колас выбралі такія псеўданімы?
3. Назавіце дату і месца іх нараджэння.
4. Параўнайце гэтых людзей: чым яны падобныя і чым адрозніваюцца?
5. Успомніце і назавіце найбольш вядомыя паэмы Янкі Купалы.
6. Назавіце паэмы Якуба Коласа.
7. Згадайце назвы апавяданняў Якуба Коласа.
8. Назавіце камедыі Янкі Купалы.
9. Назавіце вершы Янкі Купалы, пакладзеныя на музыку.
10. Назавіце пасаду, якую займаў Я.Колас напрыканцы жыцця.
11. Што вы ведаеце пра сем'і Я.Коласа і Я.Купалы?
12. Як увекавечана памяць аб гэтых людзях?

**II. Размінка (пытанні ў канвертах)**

1. Назавіце сапраўдныя імёны Купалы і Коласа (запішыце поўнасцю прозвішча, імя і імя па бацьку).
2. Чаму Купала і Колас выбралі такія псеўданімы?
3. Назавіце дату і месца іх нараджэння.
4. Параўнайце гэтых людзей: чым яны падобныя і чым адрозніваюцца?
5. Успомніце і назавіце найбольш вядомыя паэмы Янкі Купалы.
6. Назавіце паэмы Якуба Коласа.
7. Згадайце назвы апавяданняў Якуба Коласа.
8. Назавіце камедыі Янкі Купалы.
9. Назавіце вершы Янкі Купалы, пакладзеныя на музыку.
10. Назавіце пасаду, якую займаў Я.Колас напрыканцы жыцця.
11. Што вы ведаеце пра сем'і Я.Коласа і Я.Купалы?

12. Як увекавечана памяць аб гэтых людзях?

**III. Тэарэтычны турнір**

1) Вызначце від апісання ў літаратурным творы. Абгрунтуйце свой адказ. Праз якія сродкі мастацкай выразнасці перадаецца адухоўленасць прыроды? (Паэма Я.Коласа «Сымон-музыка», урывак з трэцяй часткі «0, край родны, край прыгожы!».)

*О, край родны, край прыгожы!*
*Мілы кут маіх дзядоў!*
*Што мілей у свеце божым*
*Гэтых светлых берагоў,*
*Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,*
*Дзе бары-лясы гудуць,*
*Дзе мядамі пахнуць грэчкі,*
*Нівы гутаркі вядуць;*
*Гэтых гмахаў безгранічных*
*Балатоў тваіх, азёр,*
*Дзе пад гоман хваль крынічных*
*Думкі думае прастор;*
*Дзе ўвосень плачуць лозы,*
*Дзе вясной лугі цвітуць,*
*Дзе шляхом старым бярозы*
*Адзначаюць гожа пуць?*

2) Узгадайце слова-эпітэт, якое выкарыстоўвае Я.Колас у паэме «Новая зямля» да слова «кут» і да дзядзькі Антося.

3) Вызначце від рыфмы па спосабе спалучэння вершаваных радкоў (парная, перакрыжаваная, кальцавая). (Урывак з паэмы Я.Коласа «Новая зямля».)

*Ідуць касцы, звіняць іх косы,*
*Вітаюць іх буйныя росы,*
*А краскі ніжай гнуць галовы,*
*Пачуўшы косак звон сталёвы.*

4) Вызначце від лірыкі паводле тэмы. Абгрунтуйце свой адказ.

*Я ад вас далёка, бацькоўскія гоні, —*
*На чужое неба ўжо гляджу сягоння.*
*Але думкай, сэрцам толькі вас я знаю,*
*Як і жыў, жыву я ў сваім родным краю.*
*І няма на свеце той вялікай меры,*
*І няма на свеце так каваных дзвераў,*
*Каб хоць на часіну — ў будні ці ў нядзелі —*
*Беларусь са мною разлучыць пасмелі!*